**Тэма: Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны**

**Мэты:** *знаёмства з важнейшымі падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, якія адбываліся на Беларусі ў 1941—1944 гг.*

**Задачы:**

*<u>а) навучання:</u> на шматлікіх подзвігах, здзейсненых у гады вайны на беларускай зямлі, паказаць вучням, як мужна і рашуча баранілі ад ворага савецкія людзі родную зямлю і ў гэтай гераічнай барацьбе атрымалі перамогу над фашыстамі; пазнаёміць вучняў з жудаснымі злачынствамі нямецкіх захопнікаў на беларускай зямлі і светлай памяццю, якую беражэ і захоўвае беларускі народ пра герояў мінулай вайны і тых, хто загінуў ад рук фашыстаў;*

б) *<u>развіцця:</u> развіваць у вучняў уменні работаць з гістарычнай картай, карцінай, малюнкам, фарміраваць у іх свядомасці пазнавальны інтарэс да падзей гістарычнага мінулага;*

*<u>в) выхавання:</u> на гераічных падзеях Вялікай Айчыннай вайны выхоўваць у вучняў любоў да Радзімы, да дарагой нам беларускай зямлі, якая была густа паліта крывёю яе абаронцаў.*

<table>
<tr><th>Даты</th><th>Беларусь у гады ваенных выпрабаванняў</th><th colspan="2">Імёны</th></tr>
<tr><td>1941-1945 гг.<br>22 чэрвеня 1941 г.<br>3 ліпеня 1944 г.</td><td>План<br>1. Пачатак вайны<br>2. Абаронцы Радзімы<br>3. Трывожныя званы<br>4. Вызваленне</td><td rowspan="3">А. Кіжаватаў<br>П. Гаўрылаў<br>І. Флёраў<br>А. Гаравец<br>М. Гастэла<br>Н. Купрыянава<br>П. Купрыянаў</td><td rowspan="3">Дзед Талаш<br>Марат Казей<br>К. Заслонаў<br>Т. Лук'яновіч<br>В. Талаліхін<br>Б. Коўзан<br>П. Баграціён</td></tr>
<tr><td>Назвы</td><td>Лагічнае заданне:</td></tr>
<tr><td>Брэсцкая крэпасць<br>Орша<br>Трасцянец<br>Хатынь<br>Мінск<br>Берлін</td><td>Чаму наш народ перамог ворага?</td></tr>
</table>

1. **Арганізацыйны момант**
2. **Праверка дамашняга задання**

*<u>Выкананне тэставых заданняў па тэме “Будаўніцтва новага жыцця”</u>*

1. **Суаднясі стрэлкай словы левага і правага слупкоў.**

| | |
|---|---|
| БССР | Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка |
| СССР | Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік |

2. **Адкажы на пытанні. Закрэслі няправільны адказ.**

*Калі пачалося на Беларусі будаўніцтва новага жыцця? (Пасля адмены прыгоннага права; Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года.)*

*Як называлася новая ўлада, якая ўсталявалася ў нас пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі?(Савецкая ўлада; царская ўлада.)*

3. **Адзнач знакам “+” праўдзівыя выказванні.**

⬜ Швейныя і трыкатажныя фабрыкі выраблялі адзенне і тканіну.
⬜ Добрушская папяровая фабрыка выраблялa салодкія прысмакі.
⬜ Станкабудаўнічыя заводы выпускалі вялікую колькасць станкоў.
⬜ Для будаўніцтва выкарыстоўвалася прадукцыя шклянога, кафельнага, цэментавага заводаў.
⬜ Сельскагаспадарчая тэхніка выраблялася на панчошна-трыкатажнай фабрыцы ў Віцебску.

4. **Чаму ў 1920–1930 гады ў БССР дзяржаўнымі мовамі былі абвешчаны беларуская, руская, яўрэйская, польская мовы? Выберы правільны адказ.**

⬜ У Беларусі жылі людзі розных нацыянальнасцей.
⬜ Разам было лягчэй будаваць новае жыццё, развіваць гаспадарку.

⬜ Людзі розных нацыянальнасцей не хацелі пакідаць БССР.

**5. З дапамогай падручніка с.107 правядзі даследаванне прычын, па якіх жыццё жыхароў Заходняй Беларусі да 1939 года было нялёгкім.**

Прычыны:

1)________________________________________________________________________

2)________________________________________________________________________

3)________________________________________________________________________

**3. Паведамленне тэмы і мэты ўрока**

*<u>Уступная гутарка</u>*

Пытанні для гутаркі

- Ад якіх ворагаў прыходзілася абараняцца нашым продкам у далёкія мінулыя часы?
- Хто такія крыжакі?
- Адкуль яны нападалі на беларускія землі?
- Хто ўзначаліў барацьбу з рыцарамі-крыжакамі?
- Як называлася бітва, у якой крыжакі былі разбіты?
- Калі яна адбылася?
- Чаму беларусы, рускія, літоўцы, палякі і іншыя воіны перамаглі крыжакоў у Грунвальдскай бітве?

*<u>Пастаноўка задач.</u>* Настаўнік адзначае, што размова пойдзе аб тым, як савецкія людзі і найперш за ўсе жыхары нашай краіны змагаліся з ворагам, каб адстаяць сваю незалежнасць. Звяртаецца ўвага на назву тэмы, план яе вывучэння, даты, назвы і імёны.

**4. Тлумачэнне новага матэрыялу**

*Над дошкай прымацоўваецца плакат "Радзіма-маці кліча!" Пад плакатам размяшчаюцца выявы "Залатой Зоркі" Героя Савецкага Саюза і ордэна Айчыннай вайны. Ніжэй — словы эпіграфа:*

*Вставай, страна огромная,*
*Вставай на смертный бой*
*С фашистской силой темною,*
*С проклятою ордой.*
*Пусть ярость благородная*
*Вскипает, как волна, —*
*Идет война народная,*
*Священная война!*

*Василий Лебедев-Кумач.*

*З левага боку ад дошкі прымацоўваюцца рэпрадукцыі карцін "Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 г." і "Мінск 3 ліпеня 1944 г.", з правага — карта "Вялікая Айчынная вайна 1941 — 1945 гг.", над картай — выява ордэна Айчыннай вайны.*

*Гучыць трывожна-урачыстая мелодыя песні-заклiку "Свяшчэнная вайна".* Настаўнік чытае словы эпіграфа, прапануе вучням разгледзець плакат "Радзіма-маці кліча!"

Праводзіцца гутарка:

- Да чаго заклікалі наш народ песня і плакат у той трывожны час?
- Для чаго патрэбна было падняць усіх людзей на барацьбу з ворагам?
- Чаму на плакаце Радзіма паказана ў выглядзе маці?
- Як называюцца фашысты ў песні?
- Чаму іх называюць "праклятаю ардой"?
- Як у песні называецца вайна?
- Чаму для нашага народа вайна была свяшчэннай?
- Якой яна была для фашыстаў?

***<u>1. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны</u>***

На досвітку 22 чэрвеня 1941 г. фашысцкія захопнікі абрушылі на гарады і вёскі нашай Радзімы тысячы снарадаў. Пачалася Вялікая Айчынная вайна. Нягледзячы на тое, што вораг значна перавышаў савецкае войска ў жывой сіле і баявой тэхніцы, мужныя воіны ў неверагодна цяжкіх умовах аказвалі супраціўленне фашыстам. Першымі ў смяротную схватку з акупантамі ўступілі пагранічнікі. Яны змагаліся да апошняй кроплі крыві, абараняючы рубяжы Радзімы. Масавы гераізм праявілі абаронцы Брэсцкай крэпасці.

*Гэта трэба ведаць.*

На ўзяцце крэпасці фашысцкае камандаванне адводзіла ўсяго толькі тры гадзіны. Захопнікі моцна памыліліся. Не такімі былі яе мужныя абаронцы, каб хутка здаць крэпасць. Дваццаць восем дзён і начэй працягвалася гераічная абарона. Ад гіганцкіх выбухау абрушваліся магутныя сцены, плавіліся метал і цэгла, а героі не здаваліся ворагу. Усяму свету вядомыя словы, якія напісалі на сценах крэпасці яе апошнія абаронцы: "Умрём, но из крепости не уйдём!", "Я умираю, но не сдаюсь! Прощай, Родина".

Разам з беларусамі абаранялі нашу зямлю людзі розных нацыянальнасцей. Напрыклад, у Брэсцкай крэпасці змагаліся воіны больш чым трыццаці нацыянальнасцей. Дзякуючы з'яднанасці ўсяго савецкага народа абарона Беларусі працягвалася каля двух месяцаў. Ваенныя планы фашысцкага камандавання былі сарваны — вораг адводзіў два месяцы на заваяванне ўсяго Савецкага Саюза! Фактычна ўвесь гэты час ён патраціў на заваяванне адной толькі Беларусі.

Дэманструецца рэпрадукцыя карціны Я. Зайцава "Абарона Брэсцкай крэпасці у 1941 г.". Дзецям прапануецца паспрабаваць расказаць, што паказана на карціне. Потым задача ускладняецца — трэба ўбачыць тое, што сведчыць аб гераічнай абароне крэпасці. Нарэшце, даецца яшчэ больш складанае заданне — паспрабаваць зрабіць апісанне карціны ў вуснай форме.

***2. Абарона Радзімы***

Падрыхтаваныя вучні расказваюць аб героях – беларусах.

***3. Зверствы фашыстаў***

Жудаснымі былі адносіны фашысцкіх акупантаў да мірных жыхароў і ваеннапалонных.

*Гістарычны дакумент.*

Яшчэ да пачатку вайны фашысты распрацавалі страшэнны план знішчэння насельніцтва на захопленай тэрыторыі і ператварэння пакінутых жывымі людзей у нямецкіх рабоў. План называўся "Ост" ("Усход"). У ім гаварылася, што цыганы і яўрэі падлягаюць поўнаму знішчэнню, рускія, беларусы, украінцы павінны быць знішчаны на 75 %, а астатнія 25 % будуць анямечаны і стануць рабамі.

Да класнай дошкі прымацоўваецца адлюстраванне мемарыяльнага комплексу "Хатынь". Настаўнік паказвае асобныя аб'екты і расказвае аб іх.

Усім нам трэба змагацца за мір на ўсей зямлі.

***4. Вызваленне Беларусі***

Падрыхтоўка да вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў пачалася яшчэ вясной 1944 г. Быў распрацаваны план баявой аперацыі, якая атрымала назву "Баграціён".

***5. На варце мірнай працы беларускага народа***

Няўмольна цячэ час. Старэюць ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Усё менш і менш іх застаецца з намі. Але ўвесь беларускі народ помніць імёны абаронцаў Радзімы, іх ратныя справы і подзвігі.

У памяць аб загінуўшых і ў гонар перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў 1954 г. (да 10-годдзя вызвалення Беларусі) у Мінску ўстаноўлены манумент Перамогі. Настаўнік чытае верш А. Астрэйкі "Плошча Перамогі".

Штогод 3 ліпеня ў нашай краіне адзначаецца вялікае свята — Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі). У гэты дзень да манумента Перамогі накіроўваецца ўрачыстае шэсце на чале з Прэзідэнтам (с. 35). У ім прымаюць удзел ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, кіраўнікі ўрада, працоўныя сталіцы, яе госці, ваеннаслужачыя, моладзь. Да падножжа абеліска ўскладаюцца вянкі і кветкі.

5. **Падвядзенне вынікаў урока**

6. **Дамашняе заданне:** *апавяданне "Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны".*

Учитель начальных классов Абитоцкая О.В